## *ФИЛОСОФИЯ*

**УДК 1(476) (091) +141.30**

# ВУЧЭННЕ АБ ЗНАКАХ У ТВОРЧАСЦІ ПРАДСТАЎНІКОЎ ПОЛАЦКАЙ НЕАСХАЛАСТЫКІ

***канд. філас. навук, доц. Г.І. КЛІМОВІЧ***
***(Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, Мінск)***

*Даследуюцца праблемы знака ў інтэлектуальнай спадчыне аўтараў, якія працавалі ў Полацкай езуіцкай акадэміі. Даследаванне пабудавана на падставе работ Дж. Анджыяліні і В. Бучынскага. Вучэнне аб знаках з'яўлялася важнай часткай развіцця не толькі схаластычнай традыцыі, яно знаходзілася ў фокусе філасофіі XIX ст., не губляе актуальнасці і ў XXI ст. У гэтым сэнсе даследаванне вучэння аб знаках у творчасці прадстаўнікоў полацкай неасхаластыкі прадстаўляецца актуальным. Мэтай даследавання з'яўляецца вывучэнне элементаў тэорыі знака ў кантэксце філасофскай сістэмы прадстаўнікоў Полацкай езуіцкай акадэміі, што дазволіць рэканструяваць больш поўна асаблівасці рэфлексіі аўтараў, належных да дадзенай плыні. У рабоце аналізуецца разуменне паняцця знака прадстаўнікамі полацкай неасхаластыкі, яго сувязь з паняццем ідэі, а таксама прапанаваныя аўтарамі класіфікацыі знакаў.*

***Ключавыя словы:*** *полацкая неасхаластыка, вучэнне аб знаках, знак, ідэя, Полацкая езуіцкая акадэмія, рэлігійная філасофія, схаластыка.*

**Уводзіны**. Вучэнне аб вызначэнні ідэй і знакаў, а таксама іх узаемасувязі знаходзілася ў фокусе філасофскіх інтарэсаў прадстаўнікоў схаластычнай традыцыі, пачынаючы яшчэ з часоў Сярэднявечча. У якасці фактараў, якія абумовілі цікавасць да такога роду даследаванняў, трэба адзначыць каментатарскі характар сярэднявечнай філасофіі, а таксама прыхільнасць да канцэптуальнага аналізу прысутных у межах дадзенай сістэмы рэфлексіі паняццяў, што ў сваю чаргу вяло да пастаяннай неабходнасці ўдакладнення і тлумачэння схаластычнага дыскурсу і, у межах дадзенай праблематыкі, паўплывала на месца і ролю праблемы знакаў у схаластычнай філасофіі. Пытанне рэпрэзентацыі ідэй у знаках было адным з цэнтральных не толькі для дадзенай плыні, яно было прадметам даследавання і па-за межамі рэлігійнай філасофіі. Пазначаная праблематыка заставалася ў коле пытанняў, якія прыцягвалі ўвагу тагачасных даследчыкаў у самым шырокім маштабе: сама тэма фармавання і функцыянавання знакаў у XIX ст. была настолькі папулярнай, што, напрыклад, прыблізна ў 1797 г. Парыжскі інстытут аб'явіў конкурс эсэ, а праблему сфармуляваў наступным чынам: "Уплыў знакаў на фармаванне ідэй" [1, с. 35]. З пазначанага вышэй лагічна вынікае актуальнасць даследавання праблемы знака ў межах філасофскай спадчыны прадстаўнікоў Полацкай неасхаластыкі.

Такім чынам, мэта дадзенага артыкула – рэканструяваць элементы тэорыі знакаў у работах прадстаўнікоў Полацкай неасхаластыкі. Дасягненне мэты ажыццяўляецца на падставе вырашэння наступных задач: па-першае, вызначыць асноўныя паняцці і праблемы, якія даследуюцца ў межах дадзенай тэматыкі; па-другое, вылучыць асноўныя ідэйныя ўстаноўкі заходнееўрапейскай традыцыі, якія паўплывалі на станаўленне пазіцыі полацкіх аўтараў. У якасці крыніц даследавання выступаюць работы прафесараў Полацкай езуіцкай акадэміі – Джузэпэ Анджыяліні – Instutiones philosophicae (Асновы філасофіі) (Полацк, 1818) [2] і Вінцэнція Бучынскага – Institutiones philosophicae (Асновы філасофіі) – Т. 1 (Вена, 1843) [3].

**Асноўная частка.** Прадстаўнікі Полацкай неасхаластыкі захавалі аўтэнтычную традыцыю аналізу праблемы знака ў межах трывіўму (граматыка, рыторыка, логіка). І Джузэпэ Анджыяліні, і Вінцэнцій Бучынскі ўключаюць пазначаныя пытанні ў раздзел логікі. Анджыяліні асвятляе дадзенае пытанне ў першым раздзеле сваёй працы "Асновы філасофіі" (Instutiones Philosophie), раздзел першы, артыкул 2 – "Аб знаках ідэй, галоўным чынам, аб паняццях, што на іх уплываюць, а таксама аб праблеме вызначэння і падзялення", які складаецца з чатырох параграфаў. Першы прысвечаны самому паняццю сімвала ідэі, другі – класіфікацыі паняццяў, трэці – паняццям, што маюць уплыў, чацвёрты закранае праблему вызначэння і падзялення. Вінцэнцій Бучынскі разглядае пазначаную праблему ў першым томе "Асноў філасофіі", першай частцы, у шэрагу канцэптаў элементарнай логікі, у раздзеле першым пад назвай "Аб ідэях і іх азначэннях", які ў сваю чаргу складаецца з наступных частак: I – "Прырода і аб'ект ідэі"; II – "Аб адрозненнях паміж ідэямі і законах, якія іх фармуюць", III – "Аб знаках ідэй".

Ідэі полацкіх аўтараў у межах даследуемай тэматыкі не прадстаўляюць сабой асобную канцэпцыю, яны павінны разглядацца як адзін са шматлікіх элементаў у межах работ аўтараў, выкананых у стылі cursus philosophicus, і стаяць у шэрагу іншых праблем метафізікі і логікі, таму факт станаўлення асобнай дысцыпліны семіётыкі ці пэўнага асобнага дыскурсу ў межах Полацкай неасхаластыкі сцвярджаць не прыходзіцца.

У гісторыі логікі праблема знака мае два асноўных падыходы. Першы з іх звязаны з традыцыяй логікаў-стоікаў, якія разглядаюць яго як канцэпт, што мае абстрактны змест, другая традыцыя звязаная са спадчынай

Аўгусціна, ён вылучае на першы план матэрыяльны складнік знака, атаясамляючы яго з нечым, што праяўляецца для пачуццяў, а таксама нечым іншым, чым ён з'яўляецца для розуму – (Signum est quod se ipsum sensui et praeter se aliquid animo ostendit ) [4], г. зн. розум пазнае нешта пры дапамозе знака. Таксама неабходна ўзгадаць пазіцыю Баэцыя, які сцвярджае, што знак у першую чаргу – гэта паняцце ў розуме чалавека. Асобна трэба разглядаць ідэі Р. Бэкана, які пераносіць знак з рэальнасці думкі ў матэрыяльную рэчаіснасць. Знакавай з'яўляецца таксама праца прадстаўніка другой схаластыкі – Педру дэ Фансэка (Pedru de Fonseca, Petrus Fonseca), які вылучае акрамя групы знакаў, вызначаных Аўгусцінам, іншую катэгорыю: "Знакі падзяляюцца дзвюма спосабамі, адным – на знакі фармальныя і інструментальныя (калі можна так сказаць), другім – на натуральныя і па ўстанаўленню" [5, с. 27]. У якасці інструментальных знакаў разглядаюцца пачуццёвыя рэчы, фармальныя знакі – гэта ментальныя ўтварэнні.

Скласці асноўнае ўяўленне аб месцы і ролі знака ў філасофскай сістэме Дж. Анджыяліні, а таксама вызначыць ідэйныя крыніцы пазіцыі аўтара можна ўжо на падставе вызначэння паняцця знака, якое прыведзена ў першым параграфе пад назвай "Аб знаках ідэй". Дж. Анджыяліні дае наступнае тлумачэнне: "Агульна кажучы, знак – гэта асобнае ад самой рэчы тое, што з дапамогай пачуццяў захоплівае ідэю ў нашым розуме" (Signum in genere est, quod ope sensum perceptum, alterius rei a se distinctae, ideam in mente nostra excitat ) [2, с. 18].

Рэфлексія аўтара адсылае да класічнай пазіцыі Аўгусціна, які разумее знак як "рэч, якая адбіваецца ў пачуццях, дае з сябе даведацца аб нечым іншым" [5, с. 27]. Параўноўваючы пазіцыі Аўгусціна і Дж. Анджыяліні, неабходна адзначыць, што для Аўгусціна першасным элементам у вызначэнні дадзенага паняцця было разуменне яго ў якасці рэчы. Абагульняецца з канцэпцыяй Аўгусціна паняцце знака Анджыяліні ў тым, што яны могуць успрымацца з дапамогай пачуццяў, з гэтага вынікае, што ў Анджыяліні, як і ў Аўгусціна, знак мае матэрыяльную прыроду. Полацкі аўтар нават прыводзіць прыклады, запазычаныя ў Аўгусціна – так апошні ўзгадвае дым як сведчанне наяўнасці агню, такі ж прыклад мы знаходзім і ў "Асновах філасофіі" Дж. Анджыяліні, які адзначае, што паняцце дыму – гэта знак, які непасрэдна звязаны з ідэяй агню [2, с. 18].

Таксама неабходна звярнуць увагу, што, як і ў Аўгусціна, выкарыстанне знака ў Дж. Анджыяліні праходзіць дзве стадыі: на першай стадыі знак "захопліваецца" пачуццямі, а потым ужо атаясамляецца з пэўнай ідэяй, якая прысутнічае ў розуме чалавека. З вышэй пазначанага лагічна вынікае, што пазіцыя Дж. Анджыяліні цалкам інспіравана ў дадзеным аспекце філасофскімі ідэямі Аўгусціна.

Падобнай да Аўгусціна з'яўляецца ў Дж. Анджыяліні і класіфікацыя знакаў. Аўтар прапануе падзяляць іх на натуральныя (naturalia) і адвольныя (arbitararia) [2, с. 18]. У Аўгусціна яны падзяляюцца на натуральныя і дадзеныя. Але сэнс, нягледзячы на некаторае розначытанне ў словах, застаецца аднолькавым: натуральныя знакі – гэта тыя, што прамым чынам звязаны з вызначанай рэччу, адвольныя не звязаны з адной канкрэтнай рэччу і маюць некалькі значэнняў [5, с. 31], адно з якіх часта сімвалічнае. Прыкладам адвольнага знака, на думку Дж. Анджыяліні, можа быць вясёлка, якая акрамя прамога мае пераноснае значэнне і разглядацца як сімвал прабачэння богам, а таксама аліва – як сімвал супакою [2, с. 18].

Дж. Анджыяліні ўжо вылучае вербальную і невербальную камунікацыю, адзначаючы, што знакі падзяляюцца на пісьменныя і жэсты, а таксама вусныя і пісьмовыя [2, с. 18].

Асобна аўтар даследуе знак як сімвал, належны да вербальнай камунікацыі, і звязаны з ім сэнс. Тут яго пазіцыя падобна да пазіцыі Т. Гобса: Дж. Анджыяліні адмаўляе знаку ў самастойным існаванні ў выглядзе сістэмы гукаў – ён заўсёды з'яўляецца вынікам адлюстравання пэўнай рэчы, таму не могуць быць словамі тыя, што сказаны памылкова, а таксама тыя, што выкарыстоўваюць няправільна з пункту гледжання семантычнага складніку [2, с. 19]. Адначасова аўтар выступае з крытыкай філосафаў Новага часу, якія, на думку Дж. Анджыяліні, падмяняюць сэнс паняццяў, але спасылкі на філасофскія сістэмы ці ідэі аўтараў, якія маюць дадзеныя недахопы ў сваіх работах, адсутнічаюць [2, с. 19]. У сувязі з гэтым вызначыць дакладна ідэйных апанентаў Дж. Анджыяліні па дадзеным пытанні не прадстаўляецца магчымым.

У сваю чаргу знакі, напоўненыя сэнсам як адлюстраваннем ідэі, у класіфікацыі, прадстаўленай на старонках работы Дж. Анджыяліні, аб'ядноўваюцца ў паняцці, якія падзяляюцца на катэгарэмы – паняцці, якія маюць пэўны родавы змест, і сінтагмы, што атрымліваюць значэнне толькі разам з выкарыстаннем катэгарэмы, – поўныя і няпоўныя, адназначныя, шматзначныя, аналагічныя, зменныя і нязменныя, трансцэндэнталіі і прэдыкаты.

Цікавасць у межах дадзенага даследавання прадстаўляюць наступныя паняцці: зменныя, трансэндэнталіі і прэдыкаты. Зменныя паняцці знаходзяцца ў фокусе даследавання, паколькі з'яўляюцца прадметам палемікі паміж прадстаўнікамі неасхаластычнай філасофіі і І. Кантам. Дж. Анджыяліні звяртаецца да ідэй Канта і сцвярджае, што пад зменнымі паняццямі апошні разумее ўсё, што ўплывае на пачуцці і павінна ўспрымацца пачуццёвым шляхам, што ў сваю чаргу прымусіла Канта выбудаваць фальшывую сістэму філасофіі [2, с. 20–21]. Правільным разуменнем, згодна з "Асновамі філасофіі" дадзенага аўтара, з'яўляецца разуменне зменнай рэчы як рэчы, якая ўтрымлівае магчымасць мутацыі ў сябе самой [2, с. 20].

Пытанне трансцэндэнталій павінна разглядацца як адно з найбольш уплывовых, таму што яно не губляе актуальнасці на працягу ўсёй гісторыі развіцця схаластычнай традыцыі. Аўтэнтычнае разуменне

трансцэндэнталіі, пачынаючы з часоў Радрыгі дэ Арыягі, з’яўляецца наступным: “трансцэндэнталіі належаць да існасці аб’екта і адэкватным чынам з ім атаясамляюцца” [5, с. 72]. Такім чынам, галоўнай характарыстыкай з’яўляецца існасны характар узаемаадносін паміж аб’ектам і знакам.

Разуменне трансцэндэнталій у творчасці Дж. Анджыяліні таксама застаецца ў межах тэндэнцый, прадыктаваных ідэямі барочнай схаластыкі: “Трансцэндэнталіі, што ўсе рэчы звязваюць, самі ў сабе такія ідэі вызначаюць, гэта, напрыклад, рэч, быццё, адзінае, дабро, ісціна” [2, с. 21].

Элементы вучэння аб знаках магчыма знайсці і ў рабоце Вінцэнція Бучынскага. Аднак, у адрозненне ад папярэдняга аўтара, апошні прысвячае дадзенай праблематыцы толькі дзве старонкі сваёй манументальнай манаграфіі, пакідаючы па-за ўвагай асноўныя варыянты класіфікацыі, прапанаванай у творчасці Дж. Анджыяліні. У сваёй рабоце дадзены мысліцель адзначае толькі падзел на натуральныя і адвольныя знакі, а таксама адназначныя, шматзначныя і аналагічныя.

У якасці філасофскага аўтарытэту, на які спасылаецца аўтар у рэфлексіі, выступаюць работы Антоніо Джэнавэзі (Antonio Genovesi) – італьянскага метафізіка, логіка, тэолага і палітэканома XVIII ст., які кіраваў першай у Еўропе кафедрай палітэканоміі. Уласцівымі рысамі філасофіі Антоніо Джэнавэзі былі выкарыстанне ў філасофіі матэматычных метадаў [6, с. 107], а таксама ідэй Лока для абароны ад “мудрагельстваў, якія адарваліся ад каранёў свету і ад практычнай карысці” [7, с. 640].

Яшчэ адзін даволі значны для дадзенага перыяду аўтар, на ідэі якога абапіраецца В. Бучынскі, разважаючы аб знаках, – яго сучаснік, як і Джэнавазі, спачуваючы эмпірызму эклектык – Жазэф-Мары Дэжарандо. В. Бучынскі ўзгадвае яго работу, якая аказала значны ўплыў на фармаванне тэорыі аб адзінстве мовы і мыслення, “Знакі і мастацтва мысліць, разгледжаныя ў іх узаемных адносінах”[3, с. 36], прадугадваючы ідэі В. Гумбальдта, выкладае ўласную канцэпцыю паходжання мовы.

Аналіз ідэй, прадстаўленых у рабоце В. Бучынскага, дазваляе сцвярджаць, што аўтар падтрымлівае пазіцыю свайго папярэдніка Дж. Анджыяліні, трактуючы знакі наступным чынам: “Для перадачы ідэй выкарыстоўваем у якасці дапамогі знешнія знакі, пытанне аб’екта ўніверсальных ідэй тут не разглядаецца. У астатнім пазнанне ў адпаведным парадку ажыццяўляць можам, выкарыстоўваючы знакі. Веданне пэўнага вопыта, які намі пазнаецца, асабліва калі гаворка ідзе аб абстрактных модусах, здзяйсняецца пераважна ў словах. Такім чынам, з дапамогай слоў вызначаем ідэі, якія знаходзяцца ў нашым розуме і якія ў філасофскай размове называем тэрмінамі” [3, с. 36].

Адначасова трэба адзначыць, што ў адрозненне ад Дж. Анджыяліні В. Бучынскі пакідае па-за межамі даследавання як само паняцце знака, так і працэдуру надання значэння, што значна ўскладняе спробу рэканструкцыі пазіцыі аўтара ў дадзеным пытанні. Разам з тым у тэксце В. Бучынскага прысутнічаюць правілы выкарыстання знака, якія дазваляюць зрабіць выснову, што знак сам па сабе не існуе, падставай яго быцця з’яўляецца наяўнасць ідэі, якой ён адпавядае. Сваю пазіцыю ў адносінах да выкарыстання знакаў В. Бучынскі фармулюе наступным чынам: 1) немагчыма выкарыстанне нявызначанага знака без ідэі і зместу; 2) немагчыма выкарыстанне знака, сэнс якога адпавядае іншаму паняццю; 3) немагчыма беспадстаўнае выкарыстанне знакаў, а таксама выкарыстанне іх у няправільным кантэксце; 4) нямагчыма дакладнае вызначэнне знака без папярэдняга назірання [3, с. 36].

**Высновы.** На падставе вышэй пазначанага прадстаўляецца магчымым зрабіць шэраг высноў.

У адпаведнасці з класічнай схаластычнай традыцыяй вучэнне аб знаках у прадстаўнікоў Полацкай неасхаластыкі разглядаецца ў межах так званага трывіўму, а менавіта – у частцы філасофскіх сістэм аўтараў, прысвечанай логіцы. Нягледзячы на актуальнасць праблемы знака як у сярэднявечнай, барочнай схаластыцы, так і ў творчасці філосафаў XIX ст., у аўтараў полацкай плыні магчыма назіраць толькі пэўныя элементы наяўнасці знакавай тэорыі, ні ў творчасці Дж. Анджыяліні, ні ў творчасці В. Бучынскага не ўзнікла ўсёабдымнага вучэння, прысвечанага дадзенай праблематыцы, таму варта сцвярджаць толькі існаванне пэўных элементаў тэорыі знакаў.

У творчасці Дж. Анджыяліні праблема знакаў раскрыта больш поўна. На аснове праведзенага аналізу магчыма зрабіць выснову аб інспіраванасці Дж. Анджыяліні аўтэнтычнай пазіцыяй Аўгусціна, які разглядае выкарыстанне знака як працэдуру, што складаецца з двух стадый.

Недахоп дадзеных не дазваляе дакладна вызначыць ідэйную крыніцу В. Бучынскага, але з аналізу прадстаўленых матэрыялаў відавочна, што ў агульным ён падзяляе пазіцыю Дж. Анджыяліні, разглядаючы знак як пэўны інструмент для рэпрэзэнтацыі ідэі, што знаходзіцца ў розуме.

Ідэйнымі натхняльнікамі аўтараў Полацкай акадэміі, акрамя класічных работ прадстаўнікоў схаластычнай традыцыі, з’яўляюцца прадстаўнікі эмпірычнага кірунку філасофіі Новага часу – Т. Гобс, А. Джэнавэзі і Ж.-М. Дэжарандо. У якасці ідэйнага апанента Дж. Анджыяліні разглядае І. Канта.

Таксама трэба адзначыць і пэўную абмежаванасць поглядаў на знакі, у адрозненне ад іншых прадстаўнікоў рэлігійнай філасофіі, якія займаліся дадзенай праблематыкай, адзіны аспект, у якім выступае знак у полацкіх аўтараў, – гэта слова, якое выкарыстоўваецца ў якасці паняцця.

Нельга таксама не адзначыць агульную лагічную лінію, якой прытрымліваецца як Дж. Анджыяліні, так і В. Бучынскі, што дазваляе сцвярджаць наяўнасць агульных тэндэнцый і канцэпцый у творчасці прадстаўнікоў Полацкай неасхаластыкі ў дадзеным пытанні. У якасці агульных тэндэнцый, што спалучаюць вучэнне аб знаках

Дж. Анджыяліні і В. Бучынскага, вылучаюцца наступныя: выкарыстанне ідэй Аўгусціна, схільнасць да выкарыстання спадчыны філосафаў эмпірычнага кірунку, разгляд знака ў кантэксце яго ўзаемаадносін з ідэяй і як вынік – выкарыстанне яго ў якасці пэўнага рэпрэзэнтатара ідэі, абмежаванне даследавання аўтараў толькі сферай вербальнага аспекту.

ЛІТАРАТУРА

1. Якушин, Б.В. Гипотезы о происхождении языка / Б.В. Якушин. – М. : Наука, 1984. – 138 с.
2. Angiolini, G. Instutiones Philosophicae ad usum studiosorum Academiae Polocensis / G. Angiolini. – Polock, 1819. – 310 p.
3. Buczyński, V. Instutiones philosophicae, pars prima / V. Buczyński. – Viennae, 1843. – 159 p.
4. Medieval Semiotics Mode of access: https://plato.stanford.edu/entries/semiotics-medieval/. – Date of access: 17.10.2022.
5. Вдовина, Г.В. Язык неочевидного. Учение о знаках в схоластике XVII в. / Г.В. Вдовина. – М. : Ин-т философии, теологии и истории св. Фомы, 2009. – 648 с.
6. Минак, В.С. Из истории использования геометрического метода в философии / В.С. Минак // Наука как общественное благо : Второй междунар. конгр. Рус. о-ва истории и философии науки, Санкт-Петербург, 27–29 нояб. 2020 г. : сб. науч. ст. / С.-Петерб. гос. ун-т, РОИФН ; сост.: Л.В. Шиповалова, И.Т. Касавин. – М., 2020. – С. 105–108.
7. Бибихин, В.В. Дженовези / В.В. Бибихин // Новая философская энциклопедия : в 4 т. – Т. 1. – М., 2010. – С. 640.

*Паступіў 23.06.2021*

## THE DOCTRINE OF SIGNS IN THE WORKS OF THE REPRESENTATIVES OF THE POLOTSK NEO-SCHOLASTICISM

***H. KLIMOVICH***

*The article considers the issues of the sign in the intellectual heritage of the authors who worked at the Polotsk Jesuit Academy. The study is based on the works of Josepho Angiolini and Vincentio Buczyńsky. The doctrine of signs was a significant part in the development not only the scholastic tradition; it was in the focus of the philosophy of the XIX century and does not lose its modernity in the XXI century. Because of all mentioned the research on doctrine of signs in the heritage of Polotsk authors has a high level of relevancy. The aim of the research is to study the theory of the sign in the context of the philosophical system built in the Polotsk Jesuit Academy. It will allow to reconstruct more fully the main ideas of the authors belonging to this trend. The scientific merit of this article is new knowledge in the problematic of understanding the sign by the representatives of Polotsk neo-scholasticism, connection between idea and sign, as well as the classification of signs proposed by the authors.*

***Keywords***: *Polotsk neo-scholasticism, doctrine of signs, sign, idea, Polotsk Jesuit Academy, religious philosophy, scholasticism.*

## УЧЕНИЕ О ЗНАКАХ В РАБОТАХ ПРЕДСТАВИТЕЛЕЙ ПОЛОЦКОЙ НЕОСХОЛАСТИКИ

***А. КЛИМОВИЧ***

*Исследуются проблемы знаков в интеллектуальном наследии авторов, работавших в Полоцкой иезуитской академии. Исследование основано на работах Дж. Анджиолини и В. Бучинского. Учение о знаках – важная часть развития не только схоластической традиции; оно находилось в центре внимания философии XIX в. и не теряет своей актуальности в XXI в. В этом смысле изучение учения о знаках в творчестве полоцких неосхоластов представляется актуальным. Целью исследования является изучение теории знака в контексте философской системы представителей Полоцкой иезуитской академии, что позволит более полно реконструировать особенности рефлексии авторов, принадлежащих к этому направлению. В статье анализируется понимание понятия знака представителями полоцкой неосхоластики, его связь с понятием идеи, а также предложенная авторами классификация знаков.*

***Ключевые слова:*** *полоцкая неосхоластика, учение о знаках, знак, идея, Полоцкая иезуитская академия, религиозная философия, схоластика.*